Навукова-метадычны часопіс

# Выхаванне і дадатковая адукацыя

4

2021

ISSN 2224-8013



Тэма нумара

**ДЗІЦЯЧЫ ЛЕТНІК: МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**

- Современные формы организации досуга учащихся: экологический профиль
- Бизнес-навигатор. Проект социально-экономического профиля в оздоровительном лагере
- Техноклуб для "физиков" и "лириков"
- Тимбилдинг в формате "квест-поход"
- Аптека на грядке. Опыт реализации экологического проекта

# Беларуская сям'я — якая яна?

## Калектыўная творчая справа

**Міжнародны дзень сям'і адзначаецца штогод 15 мая. Да гэтай даты можна прымеркаваць рэалізацыю калектыўнай творчай справы, прысвечанай сумеснаму даследаванню вучнямі паняцця "сучасная беларуская сям'я". Метадычную распрацоўку КТС прадстаўляе класны кіраўнік Ёдкаўскай СШ Лідскага раёна Таццяна Анатольеўна МАРЦЭВІЧ.**

**Мэта:** умацоўваць і развіваць уяўленні школьнікаў пра беларускую сям'ю, зыходзячы з гісторыі, культуры, традыцый і звычаяў беларускага народа.

**Задачы:**
- аб'яднаць намаганні ўсіх вучняў класа для рэалізацыі калектыўнай творчай справы;
- стварыць умовы для ўсведамлення вучнямі вялікай ролі сям'і ў сучасным грамадстве;
- акрэсліць партрэт сучаснай беларускай сям'і, абазначыць галоўныя сямейныя каштоўнасці, а таксама найбольш распаўсюджаныя праблемы, з якімі сутыкаюцца сем'і;
- стварыць умовы для праяўлення творчых здольнасцяў вучняў пры правядзенні конкурсу сачыненняў, прысвечаных сям'і;
- развіваць уменне працаваць у групе;
- выхоўваць пачуццё калектывізму і ўзаемадапамогі.

**Удзельнікі:** вучні VIII (IX) класа, класны кіраўнік.

**Абсталяванне:** ватман, беларускія ілюстраваныя часопісы для стварэння калажа, клей, нажніцы, карткі з заданнямі, ілюстрацыя "Куфэрак сямейных каштоўнасцяў", выстава фотаздымкаў і сачыненняў.

**Тэрмін правядзення КТС:** 7 дзён.

**Паслядоўнасць рэалізацыі КТС**

| № | Дзеянні | Тэрмін | Адказныя | Вынікі |
|---|---|---|---|---|
| | ***Падрыхтоўчы этап*** | | | |
| 1 | Паведамленне аб пачатку праекта, размеркаванне абавязкаў | Дзень першы | Класны кіраўнік | Стварэнне афішы КТС<br>Размеркаванне абавязкаў |
| 2 | Конкурс сачыненняў "Якой я бачу сваю будучую сям'ю?" | Дзень другі | Вучні | Калекцыя сачыненняў |
| 3 | Стварэнне фотагалерэі "Знаёмцеся — гэта мая сям'я!" | Дзень трэці | Вучні | Фотагалерэя "Знаёмцеся — гэта мая сям'я!" |
| 4 | Падрыхтоўка выразак з часопісаў для стварэння калажа "Звычаі і традыцыі беларускай сям'і" | Дзень чацвёрты | Вучні | Падборка ілюстрацый для стварэння калажа "Звычаі і традыцыі беларускай сям'і" |
| 5 | Збор інфармацыі ў школьнай бібліятэцы па тэмах: "Партрэт сучаснай беларускай сям'і"; "Праблемы сучаснай беларускай сям'і".<br>Стварэнне картатэкі тэзісаў-характарыстак па гэтых тэмах.<br>Адказ на пытанні завочнай віктарыны "Беларускія народныя традыцыі сям'і" | Дзень пяты | Класны кіраўнік<br>Вучні | Стварэнне картатэкі тэзісаў-характарыстык |
| 6 | Адказ на пытанні завочнай віктарыны "Беларускія народныя традыцыі сям'і". | Дзень шосты | Вучні | Ілюстрацыя "Куфэрак сямейных каштоўнасцяў" |

| № | Дзеянні | Тэрмін | Адказныя | Вынікі |
|---|---|---|---|---|
| | **Асноўны этап** | | | |
| 1 | Выніковае мерапрыемства падчас класнай гадзіны: абмеркаванне тэмы; зачытванне сачыненняў; афармленне калажа; ілюстрацыя "Куфэрак сямейных каштоўнасцяў"; рэфлексія | Дзень сёмы | Класны кіраўнік<br>Вучні | |
| | **Заключны этап** | | | |
| 1 | Рэфлексія<br><br>Абагульненне вопыту | Дзень сёмы | Вучні<br><br>Класны кіраўнік | Абмен уражаннямі, прапановы па далейшай сумеснай дзейнасці<br>Метадычная распрацоўка КТС |

**Чакаемыя вынікі:**

- усведамленне кожным вучнем каштоўнасцей беларускай сям'і;
- усведамленне неабходнасці стварэння сям'і ў дарослым жыцці;
- згуртаванне калектыву.

## ВЫНІКОВАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

**Арганізацыя прасторы:**

1. Зона прэзентацый (каля дошкі).
2. Зона абмеркавання (у канцы класа — кола з крэслаў).
3. Зона творчасці (пасярэдзіне класа — парты, састаўленыя для групавой работы).

### Ход выніковага мерапрыемства

**I. Арганізацыйны пачатак.**

***Зона прэзентацый***

Падрыхтаваныя вучні акрэсліваюць тэму, мэту, задачы мерапрыемства.

**1-шы вучань.** Чалавек нараджаецца ў сям'і. З сям'і ён робіць першыя крокі ў свет. Пра сям'ю думае, калі знаходзіцца далёка ад дома. Пра сям'ю клапоціцца і перажывае за яе ў цяжкія хвіліны.

**2-гі вучань.** Кожны з нас жыве ў сям'і. Кожны з нас, калі вырасце, створыць сваю сям'ю.

**3-ці вучань.** Нашы сем'і — часцінкі нашага народа з яго культурай і традыцыямі. Якая яна — беларуская сям'я? Пра гэта мы сёння і пагаворым.

**4-ты вучань.** Тэма нашай класнай гадзіны — "Беларуская сям'я — якая яна?" Мы падрыхтавалі шмат інфармацыі, якая дапаможа нам стварыць партрэт тыповай беларускай сям'і, вызначыць праблемы сучасных сем'яў.

**5-ты вучань.** Таксама мы распавядзём пра свае сем'і, стварым куфэрак сямейных каштоўнасцяў.

**II. Асноўная частка.**

***Зона абмеркавання***

Удзельнікі сядзяць на крэслах, састаўленых па кругу. Педагог прапануе вучням агледзіць свае крэслы. Некаторыя знаходзяць прымацаваныя паперкі, на якіх напісана па адным слову: "бацькоўства", "сваяцтва", "шлюб", "продкі", "радавод", "традыцыі".

Той, каму трапляецца слова, тлумачыць, як яно звязана з тэмай сустрэчы.

***Зона творчасці***

Стварэнне калажа "Звычаі і традыцыі беларускай сям'і". Вучні працуюць з загадзя падрыхтаванымі ілюстрацыямі, прыклейваюць іх на ватман. Дзейнасць будзе больш прадуктыўнай пры групавой рабоце (2—3 групы).

Калаж можа адлюстроўваць наступныя звычаі і традыцыі:

- ✔ сумесныя абеды, вячэры;
- ✔ віншаванне сваякоў са святамі;
- ✔ торт са свечкамі на дзень нараджэння;
- ✔ пажаданне "дабранач" усім членам сям'і;
- ✔ клопат пра сваяка, які захварэў;
- ✔ сумеснае прыгатаванне і ўпрыгожванне страў да святочнага стала;
- ✔ збор грыбоў ці ягад;
- ✔ праца разам на падворку;
- ✔ рамонт свайго дому;
- ✔ агульныя хобі;
- ✔ сумесны шопінг;
- ✔ суботняя ўборка з размеркаваннем абавязкаў;
- ✔ наведванне старэйшых членаў сям'і;
- ✔ адпачынак усёй сям'ёй (падарожжа, паход, курорт і інш.).

Пасля выканання задання групы вывешваюць свае работы на дошку і абараняюць іх.

***Зона творчасці***

Аўтары пяці лепшых (па меркаванні педагога) сачыненняў на тэму "Якой я бачу сваю будучую сям'ю?" зачытваюць свае тэксты. Сярод іх вучні

вызначаюць найлепшае сачыненне, аргументуюць свой выбар.

Настаўнік робіць выснову: кожны чалавек мае права на поўную сям'ю. Шчаслівая будучыня дзяцей залежыць ад таго, якое асяроддзе іх акаляе, які прыклад яны бачаць ад сваіх бацькоў.

***Зона абмеркавання***

Удзельнікі атрымліваюць набор картак з тэзісамі-характарыстыкамі. Сярод іх хлопчыкі выбіраюць тыя, што акрэсліваюць партрэт сучаснай беларускай сям'і. Дзяўчынкі выбіраюць тэзісы, якія адлюстроўваюць праблемы сучаснай беларускай сям'і.

На картках могуць быць адлюстраваны наступныя тэзісы-характарыстыкі: поўная сям'я; муж і жонка маюць адукацыю, працу; наяўнасць дзяцей; няпоўная сям'я; сумеснае баўленне вольнага часу; наяўнасць жылля; шматдзетныя сем'і; падтрымка фізічнага здароўя кожнага члена сям'і; дагляд за дзецьмі і клопат аб іх выхаванні; узаемадапамога; павага да старэйшага пакалення; сумесныя намаганні, накіраваныя на паляпшэнне матэрыяльнага становішча; эгаізм; адсутнасць павагі; шкодныя звычкі; цяжкае матэрыяльнае становішча; позняя шлюбы; нежаданне заводзіць дзяцей; грамадзянскія шлюбы; паўторныя шлюбы; злоўжыванне алкаголем; унутрысямейныя канфлікты і сваркі; адсутнасць дзяцей; няроўнасць мужа і жонкі; раўнадушша; гвалт у сям'і; адсутнасць маральнай падтрымкі; беспрацоўнасць; замкнёны лад жыцця; неналежнае выхаванне дзяцей; грубасць і ціск; разводы; нізкі культурны ўзровень бацькоў; сіроцтва.

Пасля выканання задання адбываецца абмеркаванне выбраных тэзісаў.

***Зона прэзентацый***

Экскурсія па фотагалерэі "Знаёмцеся — гэта мая сям'я!". 3—4 вучні расказваюць пра свае сем'і. Загадзя выбіраюцца тыя аповеды, якія адлюстроўваюць розныя моманты ў гісторыі беларускага народа праз гісторыю сям'і (Вялікая Айчынная вайна, аварыя на Чарнобыльскай АЭС, працоўныя дынастыі, дасягненні членаў сям'і і г. д.).

***Зона абмеркавання***

Віктарына "Беларускія народныя традыцыі сям'і".

1. Дзень ушанавання памерлых продкаў. *(Радаўніца, Дзяды.)*
2. Першы выган жывёл ў поле. *(Юр'е.)*
3. Народнае свята ў гонар Божай Маці, у наш час у гэты дзень таксама адзначаецца Дзень маці. *(Пакровы, 14 кастрычніка.)*
4. Маёмасць, якую давалі бацькі або родзічы маладой, калі тая выходзіла замуж. *(Пасаг.)*
5. Вузкі прадаўгаваты кавалак тканіны, прызначаны для выцірання твару, рук, цела ці посуду. У час вяселля на яго становяцца маладыя. *(Ручнік.)*
6. Свята, на якое нельга прыбіраць стол пасля вячэры, бо да яго прыходзяць частавацца памерлыя продкі. *(Каляды.)*
7. Вялікая скрыня з векам і замком для захоўвання тканіны, адзежы, каштоўнасцей. *(Куфар.)*

***Зона абмеркавання***

Настаўнік расказвае наступную прыпавесць:

— У адным сяле жыла сям'я са ста чалавек. У ёй панавала асаблівая атмасфера міру, згоды і ўзаемаразумення. Ніколі тут не сварыліся, не лаяліся. Чутка пра гэта дайшла да кіраўніка краіны. Вырашыў ён праверыць, ці так гэта на самай справе. Прыехаў у сяло, знайшоў галаву сям'і і спытаў, як яму ўдаецца захоўваць згоду паміж блізкімі людзьмі. Толькі папрасіў расказаць пра тое коратка, бо часу слухаць доўгі расповед не было. Стары ўзяў ліст паперы, хутка на ім штосьці напісаў, а потым уручыў кіраўніку. На паперы было напісана ўсяго тры словы: "Каханне", "Цярпенне" і "Прабачэнне". "І гэта ўсё?" — здзівіўся кіраўнік. На што стары адказаў: "Так! Гэта аснова не толькі добрай сям'і, але і свету ў цэлым..."

Прыпавесць абмяркоўваецца, дзеці выказваюць свае адносіны да слоў старога, прапануюць свае "рэцэпты" захавання ўзаемаразумення і згоды ў сям'і, прыводзяць прыклады.

Далей выконваецца заданне "Куфэрак сямейных каштоўнасцяў". Вучням даюцца паняцці, якія неабходна "скласці" ў куфэрак у парадку іх значнасці ад самага важнага да найменш значнага:

- ✓ каштоўнасць роднасных сувязяў каханне і любоў;
- ✓ каштоўнасць шлюбу — прыстойнасць, вернасць;
- ✓ здаровы лад жыцця;
- ✓ узаемапавага і ўзаемаразуменне;
- ✓ сямейныя традыцыі;
- ✓ сумеснае баўленне вольнага часу;
- ✓ талерантнасць і сяброўства;
- ✓ сумленнае бацькоўства (адказнае выхаванне дзяцей);
- ✓ павага да старэйшага пакалення;
- ✓ патрыятычнае выхаванне дзяцей.

## III. Заключная частка.

***Зона абмеркавання***

Пытанні выніковай гутаркі:

- ■ Якой вам уяўляецца сучасная беларуская сям'я?
- ■ Якія каштоўнасці яе аб'ядноўваюць?
- ■ Ці лічыце вы неабходным стварэнне ў будучым сваёй сям'і? Чаму?
- ■ Як ацэньваеце сваю дзейнасць па рэалізацыі калектыўнай творчай справы?
- ■ Які ўклад унеслі ў сумесную дзейнасць?
- ■ Ці выклікала сумесная дзейнасць інтарэс?
- ■ Якія яшчэ тэмы хацелі б разгледзіць падобным чынам?